8. Огуй О. Д. Значення: цілісність чи окремий аспект? (фізіологічно-психологічні основи формування значення та полісемії) // Мовознавство. 1999. № 6. С. 46-54.
9. Приходько А. М. Складно-сурядне речення в сучасній німецькій мові: синтактика, семантика, прагматика: дис... д-ра філол. наук: 10.02.04. К., 2002. 461 с.
10. Рахилина Е. В. О тенденциях развития когнитивной семантики // Изв. РАН: Сер. литературы и языка. 2000. Т. 59. № 3. С. 3-15.
11. Langacker R. W. A View of Linguistic Semantics // Topics in Cognitive Linguistics. Amsterdam: Benjamins, 1988. P. 49-90.
12. Leech G. N. Principles of Pragmatics. NY: Longman, 1983. 250 p.

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ДЭМАКРАТЫІ ПАВОДЛЕ КОРПУСНЫХ ДАДЗЕНЫХ

**А. М. Рудэнка**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
e-mail: alena@rudenka.com

Беларускія лексемы дэмакратыя, дэмакрат, дэмакратычны аналізуюцца паводле кантэкстаў, пададзеных у паралельным руска-беларускім корпусе і корпусе газеты "Наша ніва". Прыводзяцца найбольш частотныя і характэрныя кантэксты, вызначаецца тэматыка артыкулаў, якія ўтрымліваюць названыя лексемы.

*Ключавыя словы*: дэмакратыя; дэмакрат; дэмакратычны; корпус; кантэкст; спалучальнасць.

# REPRESENTATION OF DEMOCRACY ACCORDING TO CORPUS DATA

**A. Rudenka**
Belarusian State University
Minsk, Belarus
e-mail: alena@rudenka.com

The Belarusian lexemes дэмакратыя, дэмакрат, дэмакратычны are analyzed in contexts from parallel Russian-Belarusian text corpus and "Nasha Niva" newspaper. The most frequent and important contexts are given, the topics of articles which contain these words are defined.

*Key words:* дэмакратыя; дэмакрат; дэмакратычны; corpus; context; compatibility.

Мэтай дадзенага невялікага даследавання было высветліць, як падаецца дэмакратыя беларускамоўным жыхарам Беларусі. Я звярнулася да тэкстаў мастацкай літаратуры, узятых з паралельнага руска-беларускага корпуса www.ruscorpora.ru, і да кантэкстаў беларускамоўнай газеты «Наша ніва».

Паводле корпусных дадзеных, самая частая дыстрыбуцыя дэрыватаў кораня *дэмакрат-* наступная: *маладая, поўная, савецкая, партыйная дэмакратыя; пачаткі дэмакратыі, ніякай дэмакратыі*. Напрыклад:

*А ты – «паставіць на месца»... Дзіўнае ў цябе разуменне* ***партыйнай дэмакратыі****. – Але, вядома, я забыўся...* [Іван Шамякін. Крыніцы (1953–1956)].

Партыйнай дэмакратыі супрацьпастаўлена *гнілая дэмакратыя*:

*Адзіная душа ў свеце асталася неразбэшчанай ідэямі* ***гнілой дэмакратыі*** *і пачварнымі поглядамі на аднолькавасць людзей – не перад богам, не, а тут, на зямлі!* [Уладімір Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім (1962–1964)].

Частотным з'яўляецца фразеалагізм *развесці дэмакратыю*:

*– Навошта столькі? – падумаў Ігнатовіч. – Любіць дзед* ***развесці дэмакратыю****.* [Іван Шамякін. Атланты і карыятыды (1970–1974)].

*– Не, ты памыляешся, дарагі. Гэта цяпер* ***развялі дэмакратыю****. Гатовы ўсіх свалачэй рэабілітаваць* [Васіль Быкаў. Мёртвым не баліць (1965)].

*– Распусцілі народ!* ***Дэмакратыю развялі****! Вопытных работнікаў шальмуеце* [Васіль Быкаў. Мёртвым не баліць (1965)].

Характэрным з'яўляецца часты ўстойлівы выраз з назоўнікам *дэмакратыя – краіны народнай дэмакратыі*, а таксама найменні паняццяў, якія часта ўжываюцца поруч з ім (калекцыя, паводле тэрміналогіі прафесара Е. Бартміньскага). Прывядзем некаторыя кантэксты поўнасцю:

*1. Гвалт пра* ***незалежнасць, дэмакратыю, нацыянальную ідэю, славянскае адзінства і народнае шчасце*** *выклікаў слыхавую алергію – і хацелася, каб усе знямелі* [Уладзімір Някляеў. Лабух (2002–2003)].

*2. На самым пачатку СНБ дэкляруецца паўсюдная і канчатковая перамога каштоўнасьцяў свабоды,* ***дэмакратыі*** *й прадпрымальніцтва.* [Руслан Хестанаў. Новы Сьвет, абяцаны Амэрыкай (А. С., 2003)].

*3. Дагаварыўся, урэшце, да таго, што толькі пад эгідай моцнага славянін адчувае раскошу і замілаванне, што духу славянскіх народаў не ўласцівыя ўсе формы парламентарызму і* ***дэмакратыі****, прыдуманай бязбожнымі французамі, што заўсёды яны будуць адчуваць духоўную патрэбу ў манархіі* [Уладзімір Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім (1962–1964)].

*4. Сённяшняе пасяджэнне "левіцы" і "цэнтра" нашай арганізацыі аднагалосна згадзілася з тым, што дасягнуць нашай мэты, гэта значыць волі і* ***дэмакратыі****, нельга іначай, чым праз паўстанне.* [Уладзімір Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім (1962–1964)].

Найчасцейшай калекцыяй дэмакратыі з’яўляецца свабода, і кантэкстаў накшталт *свабода і дэмакратыя* можна знайсці многа.

Антыподамі дэмакратыі, паводле паралельнага руска-беларускага корпуса, выступаюць розныя палітычныя сістэмы:

*1. Гэта не **дэмакратыя**, гэта – **анархія**. Дрэнна яны разумеюць дэмакратыю! I Малашанка – дрэнь...* [Іван Шамякін. Крыніцы (1953–1956)].

*2. У гэтым якраз праблема Расіі, а не ў дурнях і дарогах, і тым больш не ў **манархіі** ці **дэмакратыі**.* [Уладзімір Някляеў. Лабух (2002)].

*3. Наогул **дэмакратыя** ў барацьбе з **таталітарызмам** ня мае адэкватных сродкаў* [Васіль Быкаў. Афганец (1998)].

Газета «Наша ніва» прапануе іншыя апазіты дэмакратыі, якія часта выяўляюцца ўжо ў назвах артыкулаў: «Між нафтай і дэмакратыяй»; «Газ і дэмакратыя»; «Украіна між дэмакратыяй і постсаветчынай»; Архан Памук: «Я веру, што іслам сумяшчальны з дэмакратыяй»; «А пры чым тут дэмакратыя да стралянiны?»

Аналіз і падсумаванне кантэкстаў “Нашай нівы” дае магчымасць вылучыць макратэмы артыкулаў, у якіх сустракаецца назоўнік *дэмакратыя*. Найчасцей “Наша ніва” цытуе і каментуе выказванні Лукашэнкі аб дэмакратыі. Гэта характэрна ўжо само па сабе: разважаючы пра дэмакратыю, незалежная газета абірае пачатковым пунктам, кропкай адліку словы апанента.

8 Кас 2015. *Лукашэнка распавёў, што такое **дэмакратыя**... «**Дэмакратыя** – гэта перш за ўсё народ, гэта дзяржава, якая робіць усё ў інтарэсах народа».*

18.04.2018. *Лукашэнка ў Кішынёве: «У вас дэмакратыя, а не дыктатура, як у нас!».*

20 Кас 2012. *Лукашэнка: «Мне ваша **дэмакратыя** непатрэбная... Нам патрэбна нармальнае жыццё людзей, нармальная эканоміка, бяспека людзей і гэтак далей. Дэмакратыя – вы лепш за мяне ...»*

6 Крс 2017. *«Плата за **дэмакратыю**»... Заходнія палітыкі павінны паглядзець на сваю дэмакратыю, перш чым крытыкаваць Беларусь. Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў у інтэрв'ю міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір», паведамляе БЕЛТА.*

7 Стд 2016 ... *Лукашэнка пра дэмакратыю: Самае галоўнае – гэта права жыць. **Дэмакратыі** і правоў чалавека ў Беларусі не менш, чым у іншых.*

Паводле цытат, дэмакратыя на Беларусі – рэч існая, дзейсная і дастатковая; толькі суб’екты дэмакратыі, г. зн. самі беларусы, могуць ацэньваць яе колькасць і якасць у сваёй краіне. Гэткая ж думка

выказваецца найвышэйшымі чыноўнікамі краіны: «Беларусь з’яўляецца дэмакратычнай краінай. Мы не павінны здаваць нікому экзамен на дэмакратычнасць. Сітуацыя з дэмакратыяй ў нас па шматлікіх параметрах лепшая, чым у еўрапейскіх краінах», – такую заяву зрабіў пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ААН у Жэневе Міхаіл Хвастоў, выступаючы 27 чэрвеня падчас абмеркавання даклада па Беларусі на сесіі Савета па правах чалавека ААН. Тая ж ідэя прысутнічае і ў выказваннях простых беларусаў, аб чым сведчыць, напрыклад, відэаапытанне на вуліцах, якое праводзілася газетай «Наша ніва», – «Навошта трэба дэмакратыя?» (https://horki.info/navina/591.html).

Якія яшчэ ідэі-топікі прадстаўлены ў артыкулах, дзе сустракаюцца дэрываты асновы *дэмакрат-*?

Называюцца, часам у гумарыстычным сэнсе, разнавіднасці дэмакратыі: *дэмакратыя па-рэчыцку; дэмакратыя па-славацку; дэмакратыя па-беларуску; дэмакратыя маёй мамы.*

Дэмакратыя – небяспечная рэч, з розных прычын. Па-першае, пра яе небяспечна гаварыць з прычыны палітычнай гіперлаяльнасці, а па-другое, з прычыны пэўнай агрэсіўнасці прапагандыстаў дэмакратычных ідэй:

9 Крс 2007 ... ***Дэмакратыя** ці дыктатура дэмакратаў.*

З другога боку, дэмакратыя сама ў небяспецы, часам іменна з-за яе дэмакратычнасці, і патрабуе гарантый:

24 Трв 2002 ... *Што гарантуе **дэмакратыю**. Гэтая гутарка былога галоўнага рэдактара «НН» Сяргея Дубаўца і аглядальніка «Белорусской деловой газеты».*

6 Жнв 2008 ... *Дэмакратыя **дэмакратыяй**, а рэгістрацыя – дулю. Вярхоўны суд пастанавіў адмовіць у скарзе заснавальнікам грамадзкай арганізацыі ...*

У беларускамоўным дыскурсе паняцце дэмакратыі непарыўна звязана не толькі з паняццем свабоды, але і з паняццем выбараў. Выбары – гэта іспыт і доказ дэмакратычнасці грамадства:

2 Лпн 2015 ... *Дэмакратыя ў Беларусі пачалася з выбараў 1994 года. На іх жа яна і скончылася.*

20 Сне 2006 ... *Мясцовыя выбары бяз выбару: 97% акругаў безальтэрнатыўныя.*

Незалежнай прэсе, таксама як большасці тэкстаў mass media, характэрныя «пустыя» кантэксты і «прыгожыя» словы, якія сведчаць, што дэмакратыя – чужы канцэпт. Ён азначаецца, але ніяк не перажываецца, ягоныя дэфініцыі і кантэксты – шаблонныя, мёртвыя

нават для беларускамоўнай прэсы і тым больш для многіх грамадзян Беларусі:

5 Лпн 2015 ... *Мы напісалі яркую старонку гісторыі, дэмакратыю нельга шантажаваць. Народ, у якога ёсць вера ў дэмакратыю, можа выстаяць* ...

Лексема *дэмакрат* ужываецца толькі ў значэнні ‘прадстаўнік пэўнай партыі’, не згадваюцца перакананні ці погляды:

*Вярхоўны Суд адмовіў хрысьціянскім дэмакратам; Нацыянал-дэмакратам на выбарах трэба разлічваць...; Сацыял-дэмакраты не павінны гуляць у лібералізм; Еўрапарламент абраў новага старшыню, ім стаў нямецкі сацыял-дэмакрат* і г. д.

Слова *дэмакратычны* сустракаецца ў назвах краін (*Беларуская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка*) і партый (*Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Хрысьціянска-дэмакратычная партыя*). З іншых калакацый можна назваць *дэмакратычны кандыдат, дэмакратычная газета, дэмакратычныя сілы, дэмакратычныя арганізацыі, дэмакратычная ўлада, дэмакратычныя выбары, дэмакратычныя актывісты, дэмакратычныя працэсы, дэмакратычны рух, дэмакратычны ўрад, дэмакратычны шлях, дэмакратычны клімат*.

Напрыканцы хацелася б прывесці вельмі «беларускі» кантэкст, дзе характарыстыкі талерантны і дэмакратычны падаюцца як сінанімічныя:

9 Сне 2016 ... *былі занадта **талерантныя і дэмакратычныя**, таму й заступілі месца некаму менш дэмакратычнаму і талерантнаму.*

Само слова *дэмакратыя* і дэрываты таго ж кораня з’явіліся ў беларускай мове на мяжы XIX-XX стст. пад уплывам рускай мовы і ў ранейшых крыніцах не знойдзены. У Слоўніку мовы Нашай Нівы (1906–1915), першай беларускай газеты, якая друкавалася як кірыліцай, так і лацінкай, ёсць такія фіксацыі: DEMAKRAT *м.* Член дэмакратычнай партыі, фракцыі, арганізацыі. ДЭМАКРАТА *м.* Прыхільнік дэмакратыі, дэмакрат. ДЭМАКРАТЫЗМ *м.* Сістэма поглядаў, адносін, дзеянняў, заснаваная на прызнанні дэмакратыі. ДЭМАКРАТЫЧНЫ, ДЭМОКРАТЫЧНЫ (4), DEMOKRATYĆNY *прым.* 1. Заснаваны на прынцыпах дэмакратыі. // Які прытрымліваецца дэмакратычных поглядаў. // Народны [1, с. 8].

Такім чынам, “Наша ніва” захоўвае дадзеныя пра найранейшыя і сённяшнія ўжыванні названага словаўтваральнага гнязда.

**Библиографические ссылки**

1. Слоўнік мовы Нашай Нівы (1906-1915). Т. 2 (Д-Н); навук. рэд. В. П. Лемцю-гова. Мінск: Тэхналогія, 2007.